# КОМПЛЕКС БЫЛОЙ СЯДЗІБЫ "АЛЕСІНА": ДОМ, ГАСПАДАРЧАЯ ПРЫБУДОВА, БРОВАР (ЧАСТКА 1), БРОВАР (ЧАСТКА 2), СКЛАД, ГАРАЖ (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, АГ. АЛЕСІНА)



***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": дом, гаспадарчая прыбудова, бровар (частка 1), бровар (частка 2), склад, гараж.***




***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": дом***



***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": гаспадарчая прыбудова***



***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": бровар (частка 1)***



***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": бровар (частка 2)***




***Комплекс былой сядзібы "Алесіна":  склад***



***Комплекс былой сядзібы "Алесіна": гараж***

**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь):** 613Г000571

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, аг. Алесіна

**Каардынаты:** 53.954516, 28.230006

**Кароткае апісанне:**

Комплекс былой сядзібы Алесіна – помнік архітэктуры (**613Г000571**), які знаходзіца ў аг. Алесіна. У комплекс былой сядзібы ўваходзяць: дом, гаспадарчая прыбудова, бровар (частка 1), бровар (частка 2), склад, гараж. Пабудаваны з каменю і цэглы.

**Апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці:**

Будынкі знаходзяцца на поўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пабудаваны ў пачатку XX ст. з каменю і цэглы. Размешчаны на тэрыторыі 1,5 га ўздоўж дарогі, якая пераходзіць у галоўную вуліцу вескі. Спалучэнне featured рознакаляровых камянеў і чырвонай неатынкаванай цэглы надае будынкам маляўнічы каларыт.

Жылы корпус з гаспадарчай прыбудовай мае Т-вобразную планіроўку. Дом пабудаваны з цэглы, падзелены 2 капітальнымі сценамі на 3 часткі. Бакавыя двухпавярховыя, завершаны пакатнымі дахамі, цэнтральныя трохпавярховыя, вылучана рэзалітам пад двухсхільным дахам. З паўднёвага боку да корпуса прыбудаваны з цэглы і каменю нізкі аднапавярховы будынак. Сцены збудавання прарэзаны паўцыркульнымі і прамавугольнымі аконнымі і дзвярнымі праёмамі, люкарнямі, паўцыркульнымі варотамі. У дэкаратыўным убранстве фасадаў выкарыстанны нішы, лапаткамі, ліштвы з броўкамі і карнізамі.

Будынак бровара Т-падобны ў плане. Складаецца з 4 аб’ёмаў, накрытых пакатымі двухсхільнымі дахамі з шчытамі ў тарцах. У агульнай кампазіцыі будынка дамінуе высокі аб’ём, які выступае невялікім рызалітам за плоскасцьгалоўнага фасада. Сіметрычная вось дзеліць корпус на 2 роўныя крылы, пастаўленыя перпендыкулярна да асноўнага аб’ёму. Сцены будынка ўзведзены з каменя-валуна, вуглы і абрысы шчытоў выкананы з цэглы ў выглядзе лапатак. Дэкаратыўная апрацоўка збудаваннння сціплая.

Будынак гаража прамавугольны ў плане, вырашаны ў выглядзе магутнага паралелепіпеда, накрытага двухсхільным дахам. Цягляныя сцены расчлянёны плоскімі лапаткамі, паміж імі на ўсходнім і заходнім фасадах зроблены паўцыркульныя нішы і аконныя праёмы. Глухія тарцовыя сцены завершаны трохвугольнымі франтонамі, у тымпанах якіх паўцыркульныя вокны. Простае дэкаратыўнае вырашэнне фасада прадыктавана ўтылітарным прызначэннем будынка [1, с.198].

Будынак склада квадратны ў плане, перакрыты двухсхільным дахам, пабудаваны з цэглы і каменя. Глухія тарцовыя сцены. У паўночным фасадзе зроблены 2 паўцыркульныя нішы і 2 аконных праёма.

Комплекс будынкаў – помнік прамысловага будаўніцтва.

**Гістарычная даведка:**

Алесіна – маёнтак на паўднёвым усходзе сучаснага Смалявіцкага раёна, які некалі ўваходзіў у склад буйнога кангламерату мясцовых маёнткаў і хутароў.

Вядома, што ў XV стагоддзі большая частка тэрыторыі сучаснага Смалявіцкага раёна была перададзена ва ўладанне Судзімонту Доргевічу. Варта адзначыць, што Судзімонт Доргіевіч з'яўляецца стрыечным братам Радзівіла Осцікавіча – заснавальнкам славутага рода Радзівілаў. За службу вялікім князем пан Судзімонт атрымаў шэраг маёнтакаў, значаная частка якіх была вылучана са складу былога Лагожскага княства. Пасля смерці Судзімонта ў 1448 годзе ўласнасць пераходзіць яго сыну Алехну. Вядома, што Алехна памёр ў 1491 годзе і яго ўладанні былі падзеляны паміж трыма дачкамі (да другой паловы XVI ст. зямля пераходзіла бліжэйшым сваякам роду) [3, с.28–32].

У другой палове XVI ст. Смалявіцкая зямля перайшла ва ўласнасць славутага роду Радзівалаў, у чыіх руках заставалася потым на працягу трох стагодзяў [3, с.32].

У 1793 г. у выніку другога раздела Рэчы Паспалітай уся тэрыторыя Смалявіччыны была далучана да Расійскай імперыі. Асноўная яе частка была падзелена паміж новаўтворанымі Барсыўскім і Ігуменскім паветамі Мінской губерні, а невялкая частка на паўночным захаде ўвайшла ў Мінскі павет [3, с.58].

У XIX ст. значная частка зямель сучаснай Смалявіччыны знаходзілася ва ўласнасці знакамітага рода Манюшкаў. Ім належалі вёскі Алесіна, Шыпяны, Студзёнка, Туры, Заброддзе, Дабраводка, Верхмень, Дуброва, Роткаўшчына [3, с.82]. Варта адзначыць, што вёска Алесіна вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст., калі населены пункт уяўляў сабой фальварак [3, с.642]. Паводле перапісу 1897 г. Алесіна, маёнтак памешчыкаў Ваньковічаў, складаў 1 двор, 158 жыхароў [3, с.642].

Як сведчаць даследванні А.К. Ельскага, маёнткі Шыпяны і Алесіна ў канцы XIX – пачатку XX ст. былі пасагам кузіны кампазітара Станіслава Манюшкі – Паўліны Манюшка [3, с.83].

Калі Паўліне Манюшцы споўнілася пяць гадоў, памёр яе бацька. Таму справы па спадчыне, якая ёй дасталася, вёў на той час старшыня Мінскай палаты грамадзянскага суда Яўстах Прушынскі. Да яе паўналецця багацце памножылася ў разы, бо ўпраўляючыя, якіх ён наняў, умела распараджаліся маёмасцю. Магчыма, менавіта Прушынскі пазнаёміў нявесту з будучым мужам – Леанам Ваньковічам, які таксама меў дачыненне да судовай сістэмы Мінскай губерні.

Падчас вяселля нявеста вельмі хацела праехаць на санях. Таму дарогу ад Алесіна да Шыпян пасыпалі крухмалам і цукрам – яны нібыта выраблялiся на мясцовым заводзе. Пасля мясцовыя жыхары збiралi каштоўныя прадукты і выкарыстоўвалі іх на свае патрэбы. Але, як сцвярджаюць гісторыкі, гэта ўсяго толькі легенда, бо на той час такой вытворчасці ні ў Алесіна, ні ў Шыпянах не было.

Шмат для ўладкавання памесцяў зрабіў сам Ванькові̇ч – на той час адзін з самых паспяховых землеўладальнікаў, які з 1878 года засядаў у Мінскім сельскагаспадарчым таварыстве, атрымаў чын правадзейнага стацкага саветніка і, вядома, меў магчымасці і сродкі для развіцця памесцяў. У 1896 годзе ён пабудаваў у Алесіна бровар. Насупраць яго выкапаў два штучныя тэхнічныя вадаёмы. Асабліва імклівыя прамысловыя пераўтварэнні памесцяў Ванькові̇чаў пачаліся ў канцы XIX стагоддзя. У фальварку Дубрава было ўзведзена некалькі каменных будынкаў – па ўсёй верагоднасці, склады, дзе назапашвалася сыравіна з наступнай яе дастаўкай на іншыя заводы для перапрацоўкі.

У 1903 годзе сышла ў іншы свет Паўліна Ванькові̇ч. Пасля смерці Леана і Паўліны ўладанні перайшлі да іх сыноў: Пятру і Лявону [4].

Пётр Львовіч стаў уладальнікам маёнткаў Шыпяны, якія ў канцы XIX ст. налічвалі больш за 5.000 дзесяцін зямлі, і Алесіна з яго шырокай бібліятэкай і архівам Манюшак, з каштоўнай калекцыяй манет, медалёў і малюнкаў. Леў Львовіч успадкаваў маёнткі Волма, Смілавічы [2].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на базе маёнтка ўзніклі пасёлак, сельскагаспадрчая арцель «Новае Жыццё». На пачатку 1930-х гадоў працавалі калгас «Новае Жыццё», кузня, крхмальны і малочны завод. У Вялікаю Айчыную вайну вёска спалена нямецка-фашысцкімі захопнікамі, але будынкі былога бровара ацалелі.

Назва «Новае Жыццё» не прыжылося, таму пасля Вялікай Айчынай вайны Алесіна вярнулі яго старую назву. Алесінскі завод Ванькові̇чаў да вайны функцыянаваў па прызначэнні, а пасля вайны быў закінуты, не гледзячы на тое, што яго пабудовы былі аднымі з самых буйных і дыхтоўных ў вёсцы.

Вернутыя да жыцця гэтыя пабудовы былі толькі ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў, дзякуючы дырэктару мясцовага калгасу Фёдару Прывалаву.

Будынкі адрамантаваны, тэрыторыя вакол добраўпарадкаваная.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2. / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1987. – К. 2. – 308 с.

2. Нацыянальны Мастацкі Музей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://artmuseum.by/ru/sovet-roda-vankovichei. Дата доступу: 15.07.2025.

3. Памяць: Гіст-дакум. хроніка Смалявіцкага р-на і г. Жодзіна. / рэдкал.: Г. К. Кісялёў [і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.

4. Рэдакцыйна-выдавецкая установа «Выдавецкі дом «Звязда» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/ru/news/20190806/1565104779-kak-pavlina-monyushko-ehala-po-krahmale-i-sahare. Дата доступу: 15.07.2025.